# Сталыпінскія палітычныя рэформы ў трэцячэрвеньскі перыяд (1907–1912 гг.)

*М. М. Забаускі*

Па патрабаванні П. А. Сталыпіна 19 жніўня 1906 г. Мікалаем II было зацверджана Палажэнне аб ваенна-палявых судах для расправы з рэвалюцыйным рухам. Толькі ў 1906–1907 гг. па іх прыгаворах было пакарана смерцю больш 1100 чалавек, тысячы накіраваны на катаржныя працы. Але ўжо ў лютым 1907 г. новы прэм'ер-міністр Расійскай імперыі сфармуляваў сваё крэда як палітыка і дзяржаўнага дзеяча наступным чынам: «Рэвалюцыю парадзілі ў большай ступені недахопы ўнутранага ўкладу, па-гэтаму рэформы ў час рэвалюцыі неабходны... Звяртаць творчасць урада на паліцэйскія мерапрыемствы – прызнак бяссілля правячай улады» [1, с. 20–21].

З гэтай нагоды была распачата аграрная рэформа. Узровень даследавання абазначанай тэмы пазбаўляе нас ад неабходнасці асвятляць сутнасць і ход аграрнай рэформы і вызначаць яе значэнне для гісторыі ў вызначаны перыяд. Падкрэслім толькі, што стаўка на разбурэнне абшчыны і насаджэнне «моцнага селяніна» мела дзве мэты: адвесці сялян ад барацьбы за памешчыцкія землі і перацягнуць сялянскія вярхі на бок контррэвалюцыі; стварыць у асобе «моцнага сялянства» новую апору для ўрада. Але для гэтага неабходна было зрабіць палітычныя высновы з аграрнай рэформы шляхам перабудовы ўсёй сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання, каб забяспечыць селяніну-ўласніку большую палітычную вагу ў вёсцы.

Менавіта як палітычная разглядалася рэформа мясцовага самакіравання ў падпісаным П. А. Сталыпіным прадстаўленні Міністэрства ўнутраных спраў у Савет міністраў ад 7 студзеня 1907 г. [2].

У аснову праекта земскай рэформы быў унесены прынцып бессаслоўнасці і шматступенчатасці земскіх органаў: валаснога, павятовага, губернскага.

Ніжэйшай ступенню сістэмы мясцовага самакіравання прадугледжвалася зрабіць сельскае таварыства (акругу) з абшчынамі і прыватнаўласніцкімі землямі, акрамя памешчыцкіх. Далей ішла воласць, якая ахоплівала тэрыторыю, уключаўшую ў сябе сельскія таварыствы і прыватныя ўладанні, маючыя статус сельскіх акругоў. На чале воласці знаходзіўся выбарчы распарадчы орган. У склад воласці ўжо ўключаліся і памешчыцкія землі, на якія адпаведна перакладвалася частка валасных грашовых павіннасцей.

Прадугледжвалася размеркаванне выбаршчыкаў на чатыры курыі і паніжаўся выбарчы цэнз. У першую і другую курыі ўключаліся ўсе землеўладальнікі ў залежнасці ад памеру ўладанняў; у трэцюю – уладальнікі гарадскіх маёмасцей і гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў. Ад валасных земстваў (чацвёртая курыя) маглі быць абраны і сяляне. У праекце, такім чынам, ураўноўваліся правы землеўладальнікаў дваранскага і недваранскага паходжання [3, с. 201–204].

Праект рэформы мясцовага самакіравання, падрыхтаваны ўрадам для III Дзяржаўнай думы, абмяркоўваўся на I Усерасійскім з'ездзе земскіх дзеячоў у Маскве (чэрвень 1907 г.). Правыя земскія дзеячы, якія дамінавалі на з'ездзе, часткова падтрымаўшы сталыпінскую аграрную рэформу, сталі ў апазіцыю да ўрадавага праекта земскай рэформы і накіравалі яго на абмеркаванне ў земскія сходы.

Важным момантам у рэформе адміністрацыйнага кіравання на месцах –гэта замена павятовага прадвадзіцеля дваранства на ўрадавага чыноўніка ў якасці главы павета. У такім жа кірунку ішла і замена земскага начальніка-дваряніна павятовым начальнікам без саслоўнага цэнзу. А па новым праекце судовай рэформы, зацвер-

джаным Саветам міністраў 19 і 23 студзеня 1927 г., дазвалялася абіраць у суддзі асоб без вышэйшай адукацыі.

Праект увядзення ўсеагульнай пачатковай адукацыі таксама быў састаўной часткай палітычных мерапрыемстваў урада, паколькі вясковай буржуазіі, якая атрымлівала большае прадстаўніцтва ў мясцовым самакіраванні, неабходна было забяспечыць адукацыйны цэнз.

Дваранства, правыя выступілі з крытыкай аграрнай палітыкі ўрада. На самым справе іх хвалявалі наступныя палажэнні рэформы: устраненне прадвадзіцеля дваранства ад кіруючай ролі ў павеце, стварэнне ўсесаслоўнай воласці і пашырэнне земскага выбарчага права. Ужо вясной 1907 г. менавіта па «палітычных матывах» правыя з прыдворных колаў, чарнасоценных нізоў выступілі за замену П. А. Сталыпіна і яго каманды (І. Я. Гурлянда, с. Я. Крыжаноўскага і інш.) на кабінет начале з П. Н. Дурнаво.

Такім чынам, імкненне П. А. Сталыпіна захаваць за памешчыкамі іх прывілеяванае становішча на месцах, але ў інтарэсах дзяржавы, а таксама неабходнасць, у той палітычнай сітуацыі, прадаставіць «моцнаму мужыку» большую ролю ў мясцовым самакіраванні і перадаць уладу на месцах чыноўніку, якога б прызначаў урад, не было зразумелым. Не падтрымалі указ ад 9 лістапада 1906 г. і земскія сходы ў 1907 г. Яны прапаноўвалі вырашаць аграрнае пытанне праз прадстаўнічую ўстанову.

Настойлівасць П. А. Сталыпіна ў зацвярджэнні законапраекта аб заходніх земствах (афіцыйная назва праекта «Аб выкарыстанні Палажэння аб земскіх установах ад 12 чэрвеня 1890 г. да губерняў Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай») прывяла да канфлікту з Дзяржаўным саветам і ўрадавому крызісу ў 1911 г.

А пачыналася ўсё з патрабаванняў да ўлады заходнімі правымі коламі ў 1909 г. Рэдактар «Киевлянина» прафесар Д. М. Піхно ўнёс у Дзяржаўны савет законапраект аб рэформе выбараў у верхнюю палату ад заходняга краю. З-за адсутнасці земскіх устаноў выбары тут праводзіліся дваранскімі сходамі, дзе колькасна пераважалі польскія землеўладальнікі, ужо ўплывала на вынікі выбараў. Д. М. Піхно ўказваў, што ад 9 губерняў у савет абіраецца 9 палякаў, у той час як польскае насельніцтва гэтых губерняў складае толькі 2–3 % ад агульнай колькасці. Правыя патрабавалі, каб палякаў вылучыць у асобную курыю, а большасць месц прадаставіць рускім. Увядзенне земства на падставе нацыянальных курый дазваляла пакончыць з манаполіяй польскага прадстаўніцтва ў Дзяржаўным савеце ад заходняга краю [4, с. 67].

Гэты праект парушаў імперскі прынцып роўнасці этнічных груп насельніцтва, паколькі палякі (больш дакладна апалячаныя мясцовыя памешчыкі) складалі большасць буйных землеўладальнікаў у заходнім краі. Тым не менш, Старшыня Савета Міністраў адобрыў праект і ўрад прыступіў да распрацоўкі законапраекта аб заходніх земствах. Менавіта з гэтага моманту, з мая 1909 г. вызначыўся новы курс П. А. Сталыпіна – абвяшчэнне прынцыпа «рускага нацыяналізму».

Новы законапраект грунтаваўся на «Палажэнні 1890 г.», але ў яго ў адпаведнасці з планамі прэм'ера быў унесены шэраг істотных змен. Замест саслоўных курый (сялянскай і памешчыцкай) уводзіліся курыі нацыянальныя – «руская» і «польская». У «рускую» курыю ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва, а ў «польскую» – каталіцкае. Царызм, такім чынам, афіцыйна пацвердзіў сваё адмаўленне факта існавання беларускай нацыі.

Увядзенне мясцовага самакіравання ў Заходнім краі было састоўной часткай сталыпінскай аграрнай рэформы. І таму не столькі абарона інтарэсаў «рускага» насельніцтва краю хвалявала прэм'ер-міністра, колькі магчымасць вывесці на палітычную арэну сапраўды «рускае» праваслаўнае сялянства. На папярэднім абмеркаванні

у думскай камісіі па мясцовым самакіраванні разгарнуліся дэбаты аб нацыянальных курый. Камісіяй было прынята рашэнне зменшыць напалову выбарчы земскі цэнз – з 15 тысяч да 7,5 тысяч рублёў. «Змяншэнне цэнзу, – пісаў П. А. Сталыпін, – паўплывае на згуртаванне масы з сярэднезаможных, асабліва рускіх уласнікаў» [5, с. 131].

Законапраект аб заходнім земстве быў буйнейшым з усіх, якія абмяркоўваліся у III Дзяржаўнай думе (1907–1917 гг.). Дыскусія наконт яго палажэнняў разгарнулася ў асноўным паміж кадэтамі і правымі, якія згуртаваліся ў адзіным – крытыцы П. А. Сталыпіна як ініцыятара законапраекта. Першыя абвінавацілі прэм'ера у нацыяналізме, другія – у яго адсутнасці, у пагрозе ўсёй рускай справе ў Заходнім краі. Для падтрымкі ўрадавага законапраекту 1 лютага 1911 г. у Думе выступіў П. А. Сталыпін. Ён быў перакананы, што без дзяржаўнай падтрымкі «рускага элемента» земствы стануць зброяй у палітычнай барацьбе палякаў супраць рускага панавання у краі.

Пасля яго выступлення на думскую трыбуну ўзышоў дэпутат ад Магілёўскай губерні У. Войніч-Сянажэцкі, які адзначыў выключна-палітычныя мэты ўрадавага праекта і галоўнае з іх – адхіленне ад земстваў мясцовых землеўласнікаў, якія з'яўляюцца носьбітамі культуры і перадача земскага самакіравання ў рукі рускіх памешчыкаў, у выніку земствы будуць займацца не гаспадарчымі, а палітычнымі справамі [6, с. 158–159]. 10 сакавіка 1911 г. прадстаўнікі польскіх колаў атрымалі аўдыенцыю у Мікалая II. Размова ішла аб земскай рэформе. Але яе лёс быў ужо вырашаны.

Законапраект П. А. Сталыпіна быў прыняты Думай. Але Дзяржаўны Савет 4 сакавіка 1911 г. 92 галасамі супраць 68 адхіліў падзел выбаршчыкаў на нацыянальныя курыі. Прэм'ер-міністру ўдалося пераканаць Мікалая II і правесці закон без ухвалення яго прадстаўнічымі органамі, але многія праекты адхіляліся ці змяняліся у час абмеркавання Думай і Дзяржаўным Саветам.

Некаторыя палітычныя задумы П. А. Сталыпіна былі ажыццяўлены толькі пасля яго смерці. Так, у 1912 г. былі прыняты законы аб пачатковых вучылішчах, (уводзілі абавязковую пачатковую адукацыю) і аб страхаванні рабочых.

Сталыпінскія рэформы, якія праводзіліся ў 1906–1911 гг. бясспрэчна мелі поспех, але яны не змаглі спыніць нарастанне сацыяльных супярэчнасцей.

*Літаратура і крыніцы*


1. Дякин В. С. Самодержавие, буржуазия и дворянство в 1907–1911 гг. Л., 1978.
2. ЦДГА, ф. 1276, воп. 2, спр. 4, л. 194.
3. Королева Н. г. Земство на переломе (1905–1907 гг.). М., 1995.
4. Ольденбург С. С. Царствование Императора Николая II. Мюнхен, 1949. Т. 2.
5. Столыпин П. А. Сборник речей, произнесенных в заседаниях Государственной думы (1906–1911). Спб., 1911.
6. Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Гродна, 2001.


## Аграрнае пытанне ў Беларусі на старонках нелегальнага эсэраўскага друку за 1907 – 1912 гг.


***Н. Р. Несцяровіч-Сярчэня***


У 1907–1912 гг. агранае пытанне займала адно з вядучых месц у грамадска-палітычным жыцці краіны. Яно было ў полі зроку ўрада, шырокіх колаў грамадскасці і палітычных партый. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. падштурхнула царызм правесці ломку перажыткаў феадалізму шляхам рэформ. Распачатая з 9 лістапада 1906 г старшынёй савета міністраў П. А. Сталыпіным аграрная рэформа была выклікана